**Да 80-годдзя Перамогі**

# *ДАНІНА  ПАМЯЦІ*

Сёлета ў працы з вучнямі нельга было абмінуць галоўную тэму 2025 года – 80-годдзе Вялікай Перамогі, бо гэта знакавы напамін пра адзін з самых трагічных перыядаў нашай гісторыі, пра гераічнае змаганне, пра  каштоўнасць чалавечага жыцця і заваяванага міру. Знамянальнаму юбілею прысвячаліся шматлікія мерапрыемствы, праекты, выставы, акцыі, канферэнцыі. Традыцыйна звярталіся да галоўных крыніц – да кніг. І на іх аснове да напісання разнастайных відаў творчых даследаванняў, эсэ, водгукаў. Звярнуўшыся да кніг пра Вялікую Айчынную вайну, вучні, напрыклад, адкрылі для сябе знакамітую кнігу сваіх бабуль і дзядуль, кнігу-легенду “Ніколі не забудзем”, напісаную дзецьмі, якія самі перажылі вайну. Зацікавілі падлеткаў і інтэграваныя заданні, дзе трэба было ў форме нарыса ці эсэ спалучыць канкрэтны гістарычны матэрыял з тэкстамі з твораў мастацкай літаратуры.  Настаўнікі гісторыі і літаратуры (М.В. Штоп і С.П. Прышчэпчык, СШ №12 імя В.У. Бабко г. Гродна) дапамаглі падабраць вучням адпаведныя выданні. Зацікавіла вучняў  кніга, што выйшла ў выдавецтве “Мастацкая літаратура” ў 2020 годзе пад назвай “Яны жылі ў буднях барацьбы”, у якой змешчаны дзённікі пісьменнікаў удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны.  Асаблівую ўвагу вучні скіравалі на кнігу з творамі пісьменнікаў з Гродзеншчыны “Памяці вечны агонь”, што была выдадзена ў мінулым годзе.

Творчыя работы, эсэ-водгукі на аснове гэтых кніг, якія вучні прэзентавалі  ў вусных выступленнях, – розныя, але галоўнае ў іх – гэта шчырасць і глыбокае разуменне значнасці захавання гістарычнай памяці.

***Алена РУЦКАЯ***

*Заслужаны настаўнік Беларусі,*

*член Саюза пісьменнікаў Беларусі*

Занеўскі Данііл 10 “А” клас

# Яны жылі ў буднях барацьбы

***ЭСЭ-ВОДГУК***

Праз доўгія дзесяцігоддзі да нас даходзяць успаміны і роздумы тых людзей, праз чый лёс прайшла адна з самых трагічных падзей XX стагоддзя – Вялікая Айчынная вайна. Сёння, калі вырасла некалькі пакаленняў, што не бачылі вайны, тэма адлюстравання тых гадоў застаецца па-ранейшаму актуальнай. Кожнае пакаленне па-свойму пераасэнсоўвае тыя страшныя падзеі, абапіраючыся на чужы досвед, чужыя ацэнкі і асабісты светапогляд. Патрэбна ж гістарычная праўда. Яна выяўляецца там, дзе ў аснове ляжыць досвед, які пражываўся самімі ўдзельнікамі тых падзей. Таму ўсё большую нашу ўвагу прыцягвае літаратура нон-фікшн, якая заснавана на фактах.

Да такой літаратуры адносіцца і кніга “Мы жылі ў буднях барацьбы” (выд. “Мастацкая літаратура”, 2020 г.), у якую ўвайшлі дзённікі чатырох пісьменнікаў: Міколы Лобана, Пятра Валкадаева, Антона Алешкі, Вісарыёна Гарбука. Роля дзённікаў, якія з’яўляюцца праўдзівымі крыніцамі па гісторыі франтавой і партызанскай барацьбы вельмі вялікая. Таму яны і на сённяшні дзень адшукваюцца, збіраюцца і зберагаюцца Беларускім дзяржаўным музеем гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і Беларускім дзяржаўным архівам-музеем літаратуры і мастацтва. Дарэчы, у ім захоўваецца дзённік нашага гродзенскага пісьменніка Аляксея Карпюка. З музея-архіва ўзяты дзённікі і для гэтай кнігі.

Самыя разгорнутыя храналагічна і факталагічна дзённікавыя запісы Міколы Лобана і Пятра Валкадаева, таму яны асабліва ўразілі.

Дзённік Міколы Лобана самы разгорнуты па адлюстраванні падзей. Першы дзённікавы запіс пачынаецца датай 22 чэрвеня 1941 года:

*“Я ўстаў у сем гадзін раніцы і сабраўся ў лес загараць і рыхтавацца да экзамену. Мінчане цэлымі сем’ямі накіроўваліся ў парк. Быў выхадны дзень*”.

З апісання аўтара відаць, што вераломны напад фашысцкай Германіі быў поўнай нечаканасцю. Нават калі завылі сірэны і на вуліцах з’явіліся вайскоўцы, людзі думалі, што гэта вучэнні. Так вырашыў і Лобан. І толькі знаёмы студэнт паведаміў яму, што пачалася вайна. Лобан запісваецца ў рады Чырвонай арміі і ідзе на фронт. У дзённіку ён праўдзіва расказвае, як цяжка было ім маладым, неабстрэленым, але яны мужна

спасцігалі навуку вайны ў баях. Пісьменнік у запісах пастаянна адзначае, што людзі дапамагалі салдатам чым толькі маглі і выказвалі веру ў перамогу:

“ *Народ настолькі жадае перамогі, што сам складае чудовішчныя выдумкі аб перамогах над немцамі і верыць у іх. Калі ў нечым абвяргаем іх, відно моцнае абурэнне”.*

Мікола Лобан піша, як марылі ўсе знішчыць ворага, сустрэць перамогу і як асабліва балюча было страчваць баявых сяброў.

Дзённік Пятра Валкадаева пачынаецца аповедам “Раніцай” – гэта была раніца-мяжа між мірным жыццём і пачаткам суровага ваеннага шляху. Валкадаеў тады служыў інструктарам дывізіённай газеты. Дывізія была каля Беластока і адной з першых прыняла на сябе вераломны ўдар фашыстаў. Аб гэтым ён піша:

“1941 *г. Вайна !!!*

*У суботу вечарам я пайшоў да рэдактара нашай газеты. Заседзеліся, я да сябе ў рэдакцыю вярнуўся ў дзве гадзіны ночы. Толькі заснуў, як пачуўся страшэнны шум, узрывы, звон разбітага шкла. Забягае днявальны і крычыць:*

- *Уставайце! Вайна! Нямецкія танкі ўжо перайшлі граніцу”.*

Аўтар расказвае аб крывавых баях, каля Валкавыска, Зельвы, аб вялізных стратах, аб тым, што дывізія мужна змагалася, але амаль уся была знішчана ў раёне ракі Зяльвянкі. Засталіся ў жывых адзінкі. Прабіраліся па лясах да сваіх, аказаўшыся на акупіраванай фашыстамі тэрыторыі, працягвалі змагацца ў партызанскіх атрадах.

Валкадаеў піша не толькі пра сябе, але і пра сваіх баявых сяброў, расказвае, як выконвалі заданні камандавання партызанскай брыгады “За Радзіму”, як збіралі звесткі пра планы і дзеянні фашыстаў і паліцаяў, здзяйснялі дыверсіі, распаўсюджвалі лістоўкі, у якіх расказвалі праўду аб падзеях на фронце. Аўтар прыводзіць тэкст адной з іх: “*Не верце нямецкай брахні, што яны хутка ўварвуцца ў Маскву. Войскі Чырвонай Арміі наносяць сакрушальныя ўдары па ворагу. Ужо разбілі фашыстаў пад Тулай і нанеслі сакрушальны ўдар пад Ціхвінам*”.

Цікавым з’яўляецца расказ аб аперацыі па вызваленні хлопцаў, якіх сілком немцы забралі служыць у паліцыю. Уражваюць радкі аб страшных умовах блакады і стойкасці партызан: “*галодныя, на лютым марозе, касцёр нельга запаліць, 11 дзён спім на снезе пад елкамі, бо над лесам кружаць фашысцкія самалёты, разведваем месца*

*для прарыву”*. У дзённіку таксама раскрываюцца жахлівыя факты пра карныя аперацыі фашыстаў, за якія партызаны помсцілі разгромам нямецкіх гарнізонаў.

Дзённікавыя запісы прыцягваюць сваёй шчырасцю, праўдзівасцю – пра страх і мужнасць, пра поспехі і пралікі, пра ўсю жудасць, якую несла вайна. Расказваючы аб трагічных падзеях, аўтары дзённікаў застаўляюць нас зразумець, якой невымерна складанай была дарога да Перамогі і як важна цаніць мірнае жыццё.

Гнідко Данііл 11 “А” кл.

# Загінуўшыя, але непераможаныя

**эсэ**

Сёлета мы адзначаем 80-годдзе Перамогі над нямецка-фашысцкімі захопнікамі. І ўжо 84 гады аддзяляе нас ад 22 чэрвеня 1941 года, калі мірнае жыццё нашай краіны абарвала вайна. Гэта быў дзень, калі ў многіх школах праходзілі выпускныя вечары. Шчаслівыя юнакі і дзяўчаты кружыліся пад музыку школьнага вальса, марылі, гаварылі пра свае планы. Яны па традыцыі выходзілі сустракаць світанак, а крывавы цень вайны ўжо навісаў над нашым краем. Менавіта пра гэта піша ў сваім вершы "За крок да вайны" Алена Руцкая:

Адкружыўся баль выпускны.
І на школьны прытульны ганак
Дружна выпырхнулі юнакі
Сустракаць у даросласць світанак.
А ружовыя туманы

Адплывалі да небасхілу...
Заставаўся крок да вайны,
Што ўздымала чорныя крылы.

Першымі, хто прыняў удар націску нямецка-фашысцкіх захопнікаў на нашай Гродзенскай зямлі – былі пагранічнікі. Лейтэнант Віктар Усаў, старшы лейтэнант Аляксандр Сівачоў, старшы лейтэнант Фёдар Кірычэнка гераічна камандавалі 3-й, 1-й і 4-й заставамі. Ніводная з іх не здалася ворагу.

Пра пачатак вайны і герояў-пагранічнікаў напісаў паэт Віктар Куц у вершы "Граніца":

Туман над каналам
Укрыў берагі.
Сувалкі – направа,
Налева – Брузгі.
Заставы, заставы –
Паўсталі сцяной
І мужна прымалі
З фашыстамі бой.
Тры раны пад сэрцам,
Нямее плячо –
Сыходзіць у бяссмерце
Старлей Сівачоў.
Б'е снапер Сарока,
Шабарын страчыць...
І вось усё знямела –
Застава маўчыць.
І Усаў апошнім
Закончыў той бой.
Граніца, Радзіма
У цябе за спіной.

Застава Віктара Усава знаходзіцца за 32 кіламетры ад Гродна.

21 чэрвеня 1941 года ўсё было звычайна. Нарад заступіў ў начное дзяжурства, раптам у цішыні дазорныя пачулі гул самалётаў, а па рацэ на лодках ужо перапраўляліся немцы. Байцы паспелі падняць трывогу, але самі загінулі. 30 пагранічнікаў пад камандаваннем лейтэнанта Усава занялі пазіцыі ў траншэях і прынялі свой першы і апошні бой. Пагранічнікі стрымлівалі ворага 10 гадзін, хаця па плану "Барбароса" на захоп пагранічнай заставы адводзілася 30 хвілін. Віктар Усаў камандаваў заставай і сам вёў агонь са снайперскай вінтоўкі. З гэтай вінтоўкай ў руках і знайшлі яго праз дзесяць гадоў у акопе, засыпаным выбухам варожага снарада.

Трэба адзначыць, што застава імя Віктара Усава – адзіная ў Беларусі, што размешчана на тым самым месцы, дзе была да вайны. Як сведчанне, што памяць пра подзвіг  геране пагранічнікаў жыве і сёння ў сэрцах людзей, як даніна памяці аб іх верш Іосіфа Ласмінскага "Застава":

За Нёманам ціхім, дзе сонца заходзіць,
Дзе лес Аўгустоўскі шуміць,
Дзе стужкаю вузкай граніца праходзіць,
Застава герояў стаіць.
Там першыя залпы вайны прагрымелі,
Ракета сігнальная ўзмыла стралой.
Ля самых слупоў пагранічных нарады
Уступілі з фашыстамі ў бой.

Пра подзвіг мужных пагранічнікаў цяпер нагадвае нам велічны мемарыял, каля падножжа якога вялікімі літарамі з бронзы пазначана: "Загінуўшым, але непараможаным воінам Беларускай пагранічнай акругі".

Ужо першыя дні вайны пасеялі ў душах людзей жах, невыносны боль і нянавісць да фашыстаў. Успамінамі свай мамы Паўлоўскай Валянціны Іванаўны, падзялілася з намі ўраджэнка Гродна Ткачэнка Ларыса Іванаўна. Яна расказала: " Мама ўспаміналі, што 22 чэрвеня ў нядзелю яна з дваюраднай сястрой Верай і яе мужам збіраліся адправіцца на параходзе па Нёмане. Недзе ў пачатку чацвёртай гадзіны яна прачнулася ад раскатаў грому (так ёй падалося). Дзядзька Сцёпа яе цёці казаў: "Дзецям не пашанцавала, збіраецца дождж, нікуды яны не паедуць". Са слязамі на вачах

Валянціна Іванаўна расказвала, што ужо ў першы дзень вайны, раніцай горад атакавалі бамбардзіроўшчыкі. Злавесны гул, слупы агню і чорнага дыму ўзнімаліся над горадам.

Нельга без хвалявання слухаць і чытаць такія балючыя аповеды пра жудасныя падзеі, што адбываліся на вачах у тых, хто тады быў такі, як мы сённяшнія. Яны бачылі пакуты параненых, плакалі над забітымі, яны былі сведкамі звярынай лютасці фашыстаў. Яны самі глядзелі ў вочы смерці. Такое нельга забыць, а іх памяць становіцца нашай памяццю.

Утлік Арына 9 “А” клас

# РАДКІ БАЛЮЧЫХ УСПАМІНАЎ

Пісьменнік Іван Чыгрынаў, які сямігадовым хлапчуком сустрэў часы ваеннага ліхалецця, успамінаў: “У вайну хапіла ўсім – і дарослым і дзецям. Гэта была жудасная пара слёз, нястач і гора. Мы рана сталі дарослымі і назаўсёды захавалі памяць пра вайну”. Пазней перажытае стане тэмай яго твораў. Сёння ж такія праўдзівыя твары патрэбны, як ніколі раней, бо ўжо выраслі пакаленні, якія могуць ведаць пра вайну толькі з кніг. Такімі кнігамі якраз і з’яўляюцца кнігі, якія раскрываюць тэму памяці аб трагедыі, якой стала для нашага народа вайна, тэму пакут, мужнасці і гераізму, які праявілі не супер героі, а звычайныя людзі, дарослыя і дзеці. Можна згадаць прысвечаныя дзецям ваеннай пары шматлікія паэтычныя і празаічныя творы Кузьмы Чорнага, М. Лынькова, Я. Брыля, І. Шамякіна, І, Навуменкі, І. Сяркова і інш. А

таксама кнігу М. Парахневіча “Маё і тваё маленства”, зборнікі пра піянераў-герояў, і, безумоўна, знакамітую кнігу “Ніколі не забудзем”, якая выйшла ў 1948 годзе і перавыдавалася шмат разоў. Яе напісалі самі дзеці. Юныя аўтары расказалі пра суровы час Вялікай Айчыннай вайны, пра гітлераўскую акупацыю, пра перажытыя пакуты і сваю барацьбу з ворагам.

Можна сказаць, што эстафета памяці працягваецца і ў наш час. Пісьменнікі нашай Гродзеншчыны выдалі шэраг кніг, у якіх знайшла адлюстраванне тэма дзяцінства, апаленага вайной. І сёння не варта думаць, што гэта тэма вычарпана. Час, памяць вымушаюць тых, хто на свае вочы пабачыў жахі вайны, яшчэ раз прайсці перажытае, успомніць і расказаць не для сябе самога, а для новых пакаленняў, для будучага, каб сцвердзіць каштоўнасць здабытага міру. Калі звярнуцца да такіх твораў-успамінаў, напісаных аўтарамі з нашай Гродзеншчыны, то неабходна сказаць, што іх можна абазначыць як дзве плыні ў адным тэматычным рэчышчы.

Першая – гэта пісьменнікі, на долю якіх выпала вайна. У іх аповедах дакладна, праўдзіва і падрабязна ўзнаўляецца перажытае.

Другая – гэта дзеці, ўнукі і нават ужо праўнукі дзяцей вайны. Яны ўзнаўляюць падзеі тых страшных гадоў на аснове аповедаў, успамінаў, перажытых іх роднымі, і выступаюць захавальнікамі памяці, адчуваючы адказнасць і ўдзячнасць.

Абедзве гэтыя плыні аб’яднаны ў зборніку “Памяці вечны агонь”, які выдадзены Гродзенскім абласным аддзяленнем Саюза пісьменнікаў Беларусі да 80-годдзя вызвалення нашай Радзімы ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У анатацыі да кнігі пазначаецца, што ў зборнік увайшлі ўспаміны аб вайне, аб родных і блізкіх людзях – удзельніках тых суровых падзей. І яшчэ пазначаецца, што “Ва ўсіх творах лейтматывам гучыць памяць і гонар за непераможную сілу духу народа, радасць жыць і тварыць пад мірным небам”

Ніколі свет не павінен забыцца на тую крывавую вайну – гэта адзінадушнае перакананне аўтараў зборніка, якія пабачылі вайну на свае вочы. Адна з такіх аўтараў Ірына Гаева. У сваім творы “Дзіця вайны” яна піша, што сучасныя дзеці чытаюць пра вайну, а яна яе ўспамінае. Успамінае, як выгнаў іх з хаты жудасны крык: “Ой, людцы! Немцы!”. Гарэла суседняя вёска Чарняты. Шугала полымя, дым, крык, было цяжка дыхаць. “Мне трох гадочкаў не было, а ад страху ножкі – нібы з ваты”. І з болем

прызнаецца, што ўсё тады перажытае “стаіць у вачах”, што кожны дзень моліцца, каб больш ніколі не бачыць такі жах.

Хлапчуком сустрэў вайну аўтар успамінаў “Я з таго пакалення” Браніслаў Ермашкевіч. Ён піша: “Я з таго пакалення, якае нарадзілася да Вялікай Айчыннай вайны. Бацькі далі мне жыццё ў жніўні 1937 года…. Літаральна перад самай вайной пераехалі ў новы дом. Мне б жыць і радавацца. Але прыйшла на Радзіму бяда. Бацька на другі дзень вайны пайшоў на фронт, дзе і загінуў”. Далей ён расказвае, што маці стала дапамагаць партызанам, паліцаі западозрылі яе. У яго дзіцячую памяць урэзалася, як паліцай вёў допыт. Прыставіўшы наган да галавы маці, пытаўся, дзе партызаны, але яна нічога яму не сказала. Раззлаваны, ён “махаў наганам перад тварам матулі і пагражаў ёй забіць мяне. Маці паўтарала, што нічога не ведае”. Яшчэ не адзін драматычны эпізод давялося перажыць хлопчыку: “Гэта адбывалася летам у 1943 годзе. Карацелі наляцелі так шалёна, што нават, нягледзячы на сігнал вартавых самаахованы, жыхары не змаглі сабрацца і збегчы ў лес. У выніку ўсе мы былі зачынены ў нейкі хлеў. Карацелі меліся спаліць нас, але, відаць, атрымалі новы загад. Пагналі ў бок Барысава. Там чыгунка – прама ў Нямеччыну. Паліцаі, быццам аўчаркі, шнырылі паміж намі і адбіралі дзяўчат і хлопцаў. Дзяцей пратрымалі ноч у нейкай хаце. З надыходам раніцы ўсім загадалі вярнуцца дахаты. Большая частка вёскі была спалена. Ніводнай жывой душы, акрамя курыцы, якая цудам выжыла, убачыўшы вяскоўцаў, з крыкам-гвалтам уцякала ад людзей”. У канцы аповеду Браніслаў Ермашкевіч прызнаецца, што не можа забыць усё перажытае і ўласнымі вачыма ўбачанае. Стрэлы, выбухі ўзрываў, папялішчы хат, лес-ахоўнік – усё гэта засталоося ў памяці. Таму і піша аўтар пра гэта, каб нішто не было забыта.

Кожны з такіх аповедаў заснаваны на перажытым, а таму вельмі кранальны сваёй суровай праўдай. Нельга без хвалявання чытаць і творы, якія напісаны на аснове ўспамінаў, што пачуты аўтарамі, ад сваіх блізкіх, у якіх адабрала радасць дзяцінства вайна. Такія творы ў зборніку “Памяці вечны агонь” таксама сведчанні тых трагічных падзей, што даюць магчымасць зразумець усю горыч перажытага тым пакаленнем дзяцей. Дзяцей, якія далучаліся да барацьбы, пад цяжарам смяротнай пагрозы дапамагалі дарослым, уносілі свой уклад у перамогу над ворагам. Напрыклад, Ксенія Урбановіч у саім творы “Зямля герояў” распавядае пра сваю вёску Дабраволя, пра тое як і дарослыя, і дзеці дапамагалі на самым пачатку вайны

параненым чырвонаармейцам, як пасля збіралі патрэбныя звесткі і перадавалі іх партызанам, нягледзечы на небяспеку. А фашысты жорстка распраўляліся з барацьбітамі. Аўтар піша: ”На вясковую плошчу да царквы сагналі ўсіх жыхароў. Побач з шыбеніцай стаялі Цімафей Іванавіч, Паша і яе браты – Іван і Алёша. Апошняму тады не было і 10 гадоў. На грудзях у кожнага вісела таблічка з надпісам: ”Яны дапамагалі партызанам”. Так была знішчана сям’я Васіленкаў ”. Так фашысты імкнуліся застрашыць людзей, але нельга было знішчыць іх жаданне вызваліць сваю зямлю, пазбавіць моцы духу. Пра гэта піша Ціхан Ганчароў у сваім эсэ “Наташкіна дзяцінства”, узгадваючы ўспаміны сваёй бабулі Шынгірэй Наталлі, якой было шэсць гадоў, калі пачалася вайна:”Ноч. Вочы зліпаюцца, але Наташа цярпліва намыльвае і трэ, палошча і развешвае, сушыць і скручвае. Гэта самаробныя бінты для параненых партызан. А маці закручвае ў ільняную дзяружку боханы хлеба. Пяклі ўдзень, каб дым з коміна ўночы не зацікавіў паліцаяў. Калі сцямнее, яго трэба будзе перадаць партызанам. Наташы хочацца адламаць кавалачак, бо і той, што сабе пакінуты, мама размеркавала на некалькі дзён. Ад духмянага паху пад лыжачкай ные ад голаду, але яна разумее і церпіць. Гэта хлеб партызанам. Ім трэба сілы для барацьбы з ненавіснымі фашыстамі” .

Пра дзяцей, якія збіралі і хавалі зброю, каб так дапамагаць партызанам, піша і Ірына Салата ў апавяданні “Дзяцінства настаўніцы”.

Звычайна кажуць, што час лечыць раны. Але не такія, якія засталіся ў душах дзяцей, перажыўшых вайну. Зноў і зноў памяць вяртае іх, як і аўтараў кнігі “Памяці вечны агонь”, да падзей тых гадоў, каб падобнае ніколі не паўтарылася, каб жыццё заўсёды было мірным, а дзяцінства было шчаслівым.